# ВОБРАЗ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў ПАЭЗІІ ЦЁТКІ

**Д. В. Карчашкіна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*pilipok616@gmail.com;*
*навук. кір. – І. М. Запрудскі, канд. філал. навук, дац.*

У рабоце даследуецца спецыфіка адлюстравання лейтматыўнага вобраза лірычнага героя ў першых, экспрэсіяністычных вершах Цёткі (Алаізы Пашкевіч), напісаных да 1906 г. і ўвайшоўшых у зборнікі «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду». Аналіз праводзіцца праз размежаванне вобразаў лірычнага героя і аўтарскага прататыпу, разглядаюцца ўласцівыя герою рысы і іх эвалюцыя на прыкладзе твораў «Мужык не змяніўся», «Хрэст на свабоду», «Ласы» і інш. Канцэптуальнасць зборнікаў, заключаная ў развіцці лірычнага героя ад індывідуалізаванай асобы да свядомага чалавека-змагара за справу беларускага адраджэння, з'яўляецца аргументам, які ставіць пад сумненне пашыранае меркаванне пра «неапрацаванасць» вершаў і «невыбітнасць» таленту пісьменніцы. Упершыню звяртаецца ўвага на наяўнасць цэнзурных правак у сучасных выданнях твораў пісьменніцы. Яны, напрыклад, значна ўплываюць на ідэйны змест верша «Хрэст на свабоду».

***Ключавыя словы:*** Цётка; лірычны герой; вобраз аўтара; лірыка; экспрэсіянізм; развіццё вобраза; самаідэнтычнасць; эмацыйнасць; рэвалюцыйная тэматыка; пафас.

«Як усе натуры, каторыя працуюць парывамі – выбухова, Цётка пачынала пісаць многа, але давадзіла да канца толькі нязначную частку распачатых прац» [2, с. 66], – адзначаў А. Луцкевіч у адным з першых артыкулаў, прысвечаных творчасці Алаізы Пашкевіч (Цёткі). І гэта сапраўды характарызавала паэтку як жанчыну, якая працавала імпульсіўна. Але жаданне пісаць ці натхненне не з'яўляецца без прычыны, таму кожны верш мае свае пафас, ідэю, адметнага лірычнага героя.

У «Кнізе пра паэзію» Р. Бярозкін пісаў: «У Цёткі ж была пэўная несінхроннасць, пэўны разрыў паміж дзвюма асноўнымі галінамі яе жыццядзейнасці: грамадскай і эстэтычнай» [1, с. 147]. Даследчык, бясспрэчна, меў рацыю, бо на грамадскія з'явы А. Пашкевіч глядзела праз прызму іх імклівасці і няспыннага руху. Адным з першых Р. Бярозкін звярнуў увагу на экспрэсіўнасць твораў Цёткі, пропуск усяго, што магло яе кранудь, праз сваё эмацыйнае ўспрыманне. Цётка прысвячала свае паэтычныя творы з'явам жыцця, міма якіх яна не магла прайсці. Адна з такіх эпахальных падзей – рэвалюцыя 1905 г. З 1904 г. пісьменніца жыве ў Вільні, і менавіта гэты час лічыцца пачаткам актывізацыі беларускага нацыянальнага руху. Найбольшую папулярнасць паэтка набыла як «пясняр рэвалюцыі». Па-першае, таму, што вершы рэвалюцыйнай тэматыкі былі выпушчаны асобнымі

зборнікамі «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду» (канец 1905 г. – пачатак 1906 г.), а па-другое, таму, што творы, змешчаныя ў іх, былі найбольш вядомымі сярод тагачаснага чытацкага кола.

Лірычным героем гэтых зборнікаў, безумоўна, з'яўляецца чалавек рэвалюцыі, прычым непасрэдна ў яго псіхалагічным сэнсе. Яго паводзіны, з пункту гледжання грамадскага жыцця, *індывідуалізаваныя*. Вобраз аўтара і вобраз лірычнага героя ў адносінах да рэвалюцыйных падзей маюць паміж сабой відавочную розніцу. Эмацыйная ўзрушанасць аўтара паказвае на наяўнасць асаблівай карціны свету і дыктуе пазіцыю «наладжвання беларускага грання як мае быць» [3, с. 47]. Бачыцца аўтарскае жаданне абудзіць лірычнага героя да актыўных дзеянняў у галіне нацыянальнага адраджэння і асэнсавання ладу жыцця. Прычым аўтар не ставіць сябе вышэй за лірычнага героя, а атаясамлівае сябе з ім, чым імкнецца паказаць, што беларусы змогуць узняцца толькі як цэлая грамада, аб'яднаная агульнай мэтай: «Веру, братцы: людзьмі станем, / Хутка скончым мы свой сон» [3, с. 54].

Па гэтых жа радках можна прасачыць і характарыстыкі лейтматыўнага лірычнага героя, адлюстраванага ў зборніку. Вобраз беларуса, які яшчэ «спіць» і не бачыць свет у аўтарскім разуменні яго шырыні. Сапраўдным «крыкам душы» з'яўляецца апісанне дарэвалюцыйнага беларуса ў вершы «Мужык не змяніўся». За васямнаццаць стагоддзяў развіцця чалавецтва і свету пазіцыя «мужыка», па меркаванні аўтара, не змянілася. Ён «цёмны» ў інтэлектуальным сэнсе, з усіх бакоў прыгнечаны і бяспраўны «хамула». Узмацняе гэты сумны вобраз прыведзеная паэткай сітуацыя магчымага дыялогу з Богам, які здзіўляецца кансерватыўнасці поглядаў «мужыка» і прапануе прасіць усё, што толькі яму патрэбна. Герой дае такі адказ на боскую прапанову: «О, дай ты мне, Божа, / Хаця нову хату, / Дай кабылу сіву / І жонку багату. / Дай кароўку з целем, / Свінку, курэй колькі, / Дай жыта, мы змелем, / І годзе, і толькі» [3, с. 55].

Менавіта ў такіх момантах вымалёўваецца дакладная мяжа паміж лірычным героем і пазіцыяй аўтара: «мужык» не дбае пра агульную будучыню, а думае непасрэдна пра індывідуальныя праблемы матэрыяльнага кшталту. Але моцна адчуваецца змена ў характары лірычнага героя ў наступным зборніку паэткі – «Хрэст на свабоду».

«У бойкай, жывой форме апавядае Цётка аб здарэньнях дня» [1, с. 63], – піша А. Луцкевіч. Паэтка, праз прызму індывідуальных перажыванняў, стварае сапраўдны экспрэсіўны «летапіс» падзей рэвалюцыі з пункту гледжання беларускай самаідэнтычнасці, перамен у грамадскай думцы, якія падрабязна адлюстраваны ў зменах вобраза лірычнага героя. Творы зборніка маюць відавочныя канцэптуальныя

сувязі, яны быццам дадаюцца адзін да аднаго. Таксама відаць, што пісьменніца імкнулася да аператыўнага рэагавання на падзеі, пра што сведчаць і даты стварэння вершаў. Усе напісаны ў 1905–1906 гг.

Са зборніка амаль знікае вобраз аўтара, які мы бачылі ў вершах «Скрыпкі беларускай». «Аўтар» пачынае адчуваць сваю «непатрэбнасць» у вершаваных радках па прычыне таго, што карціна свету і жаданні пісьменніцы, якія ў першым паэтычным зборніку былі толькі жаданнямі, цяпер становяцца рэальнасцю як для аўтара, так і для лірычнага героя. Чаканае аб'яднанне людзей у супольнасць для агульнага змагання за «лепшую долю» адбылося, і разам з гэтым змяніўся лірычны герой. Па сутнасці сваёй гэта той жа «мужык», уплыў на якога зрабілі рэвалюцыйныя падзеі. Ужо ў першым вершы з аднайменнай зборніку назвай «Хрэст на свабоду» (1905) мы назіраем паступовую трансфармацыю лірычнага героя з кансерватыўнага «мужыка-хамулы» ў чалавека, які пабачыў рэвалюцыю. З першых радкоў чытач адсылаецца да таго прыгнечанага і прыціснутага героя вершаў, які мірыўся з усім навокал і мірыцца далей: «Кроў ракамі льецца ў мора, / Салдат гіне там ад гора / Без кашулі і бяз хлеба. / Нас ня дзівіць – так і трэба!» [3, с. 63].

Пераўвасабленне такога кансерватыўнага індывідуаліста ў змагара за агульную справу складана ажыццявіць у рамках паэтычнага радка без пэўнага «трыгера» – здарэння, якое стане канчатковым штуршком да неабходнасці дзеяння. Аўтар вырашае гэтае пытанне пры дапамозе рэлігіі, якая ва ўсе часы мела моцны ўплыў на чалавецтва. Цётка выкарыстоўвае вобраз юродзівага папа Гапона для перадачы лірычнаму герою нябеснага паведамлення: «Тагды Гапон у грамаду бяжыць, крычыць: „Трэба ладу, трэба шроту, бомбаў, стрэльбаў… Чую яшчэ голас з неба, што цара павесіць трэба!“»[1] [4, с. 3].

І, як ні дзіўна, гэта паведамленне займела патрэбны ўплыў: «З той пары Масква, Варшава… Гоняць вон цара-зладзея!» [4, с. 3].

Так пачынаецца паступовы шлях пераўвасаблення лірычнага героя, які назіраецца і далей у вершах зборніка. Праз смутак і «мужыка», і аўтара, адбываецца пераход героя да свайго новага ўвасаблення. Праз яго адлюстраваны змены, якія адбываюцца ў грамадскай думцы падчас рэвалюцыйных падзей. Максімальна ярка і кантрасна адчуваецца гэта змена, калі параўнаць вобраз лірычнага героя «Скрыпкі…», які падаецца ў вершы «Мужык не змяніўся», з вобразам Пятрука з верша «Ласы».

---

[1] У выданні «Выбраных твораў» (2001) Цёткі апошнія два працытаваныя радкі не ўключаны ў рэпліку Гапона. Як рэальная гістарычная асоба, пецярбургскі поп Георгій (Гапон) у час рэвалюцыі супрацоўнічаў з паліцыяй, і, хутчэй за ўсё, Цётка не ведала аб яго крывадушнай ролі ў час так званай крывавай нядзелі.

За аснову аўтарка ўзяла вобраз канкрэтнага чалавека, але падобны лёс мог напаткаць любога ў той час. Гэта больш не кансерватыўны мужык, а чалавек з глыбокай крыўдай. І ўсё ж твор адлюстроўвае бадзёры настрой, мае мажорны пафас, што выяўляецца ў вершы праз злосць селяніна, якая пераходзіць у актыўны пратэст. Ён ужо ведае, з кім яму трэба змагацца, і з-за каго яму ў жыцці не стае свабоды – далягляды героя пашырыліся. Калі раней мужык бачыў толькі тое, што рабілася ў яго хаце, у вёсцы (вершы «Восень», «Лета»), то цяпер у поле яго зроку трапляюць з’явы дзяржаўнага маштабу. Вузкі індывідуальны погляд трансфармаваўся ў шырокі рэвалюцыйны – у гэтым відавочная эвалюцыя вобраза лірычнага героя. Ён больш не просіць у Бога дабротаў і выгодаў выключна для сябе, а просіць сацыялістаў, каб далі зброю для змагання з прадстаўнікамі ўлады.

Такім чынам, эвалюцыя лірычнага героя зборнікаў «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду» ілюструе рост рэвалюцыйнай свядомасці ў грамадстве. Праз трансфармацыю вобраза беларуса, «мужыка-хамулы», перадаюцца змены, якія змаглі адбыцца за адзін год рэвалюцыі. У выніку свайго развіцця лірычны герой максімальна набліжаецца да вобраза аўтара, амаль ідэнтыфікуецца з ім, пачынае падзяляць яго пазіцыю і светапоглядныя арыенціры, выказвае не толькі прыватныя жаданні пра паляпшэнне ўласнага жыцця, але і свае думкі і меркаванні пра палітычнае становішча ў краіне.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Бярозкін Р*. Кніга пра паэзію. Мн., 1974.
2. *Луцкевіч А*. Выбраныя творы : праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. Мн., 2006.
3. *Цётка* Выбраныя творы. Мн., 2001.
4. [*Цётка*] Хрэст на свабоду : [вершы] / напісаў Гаўрыла. [Б. м., 1906].